**В. Л. ВАРАНОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»),
**В. Э. ЗІМАНСКІ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»),
**А. В. ШАРАПАВА,**
старшы выкладчык
(міждзяржаўная адукацыйная ўстанова вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт»)

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ: аналіз заданняў і парады

## (X клас)

### Водгук на мастацкі твор

Для водгуку ў дзясятым класе было прапанавана апавяданне «Роздум» (1964) Міхася Стральцова. Выбраны гэты твор невыпадкова. Сёлета адзначаецца 85-годдзе з дня нараджэння пісьменніка.

Стральцоўскае апавяданне, якое паводле жанравых асаблівасцей можна назваць лірычнай мініяцюрай, адносіцца да філасофскай прозы. У ім уздымаюцца важныя пытанні чалавечага быцця. Тэмай для роздуму апавядальніка / героя твора становіцца пераход ад маладосці да сталасці і звязаны з гэтым неспакой перад новым жыццёвым этапам. Кожны чалавек перажывае ў жыцці некалькі такіх пераходаў, якія могуць быць па-свойму складанымі, а то і балючымі. Без пэўных ускладненняў і трывог не бывае чалавечага жыцця. З гэтым звязаны праблемы, пра якія і апавядае герой. У яго маналогу адчуваецца трывога перад будучыняй, ідэалізацыя маленства, разуменне неабходнасці зрабіць наступны крок і нерашучасць перад выбарам. Твор М. Стральцова адпавядае настрою дзесяцікласнікаў, перад якімі акурат і адкрываюцца новыя шляхі-дарогі. У гэтай сувязі варта адзначыць, што ў большасці водгукаў іх аўтары дакладна акрэслілі праблемна-тэматычнае поле твора і вызначылі яго ідэю. Сутнасць яе ў тым, што нельга баяцца жыцця, а трэба ісці яму насустрач.

У асноўным дзесяцікласнікі аргументавана выказвалі ўласную пазіцыю, прадэманстравалі добры чытацкі густ, эрудыцыю. Напрыклад, каб абгрунтаваць блізкасць героя твора і аўтара, згадвалі біяграфію Міхася Стральцова і яго апавяданне «Сена на асфальце», у якім таксама паказваецца пераход ад вясковага маленства да гарадскога дарослага жыцця. Калі гаварылі пра хуткаплыннасць часу, то прыгадвалі вершы Н. Мацяш «Дзень», Р. Барадуліна «Ранішні верш», А. Куляшова «Бывай...»; адзначаючы імкненне лірычнага героя твора да новага і адначасова боязь перад ім, згадвалі казку «Даль» і трылогію «На ростанях» Якуба Коласа, верш А. Куляшова «На паўмільярдным кіламетры». Калі засяроджваліся на праблеме розных жыццёвых перыядаў, абапіраліся на творы Р. Баравіковай «Мікрапаэма трох дажджоў», П. Панчанкі «Схема жыцця», Ядвігіна Ш. «Дуб-дзядуля»; разважаючы пра падзеі, што вокамгненна мяняюць асобу, прыводзілі аналогіі з апавяданнямі М. Лынькова «Васількі», М. Лупсякова «Мэры Кэт» і інш.

У большасці водгукаў вызначаны тры сэнсава-кампазіцыйныя часткі. Першая — гэта першы абзац, у якім герой знаходзіцца на жыццёвым перакрыжаванні, і другі — у выглядзе рытарычнага пытання: «...няўжо так пачынаецца сталасць?». Другая частка (трэці абзац) вяртае героя ў мінулае — шчаслівую пару дзяцінства. У трэцяй частцы, якая адпавядае чацвёртаму абзацу, ён ужо не задае пытанні, а знаходзіць для сябе адказы на іх. Герой яшчэ не ўпэўнены, трывожыцца, але ўжо робіць крок наперад.

Праўда, некаторыя аўтары вылучылі ў творы дзве сэнсавыя часткі і доказна патлумачылі сваё меркаванне. Такое бачанне зместавай

структуры твора журы таксама прымала як слушнае.

Практычна ўсе канкурсанты ў сваіх працах правільна вызначылі сродкі мастацкай выразнасці. У якасці прыкладаў яны называлі тропы: эпітэты *(ранейшыя радасць і смутак; росная зямля)*, параўнанне *(мне так добра з ім, як добра рэчцы ў берагах, а дрэвам у голлі)*, метафары *(рэчка сумуе; дрэва выносіць і сумуе)*; стылістычныя фігуры: шматзлучнікавасць *(і так хораша, <...> і так шкада; і шкада <...>, і трывожна)*, інверсію *(было ж і раней у мяне маленства)*, антытэзу *(радасць і смутак)*, аксюмаран *(маладая сталасць)*, сінтаксічны паралелізм, які выразна праявіўся ў двух апошніх сказах трэцяга абзаца, анафару (паўторам аб'яднаны пачатак першага і другога абзацаў). Трэба сказаць, што ўдзельнікі алімпіяды не проста называлі сродкі, але і слушна тлумачылі, чаму ці для чаго яны былі выкарыстаны: для стварэння эмацыянальнага настрою, стылізацыі пад народнае, для акцэнтацыі ўвагі чытача на найбольш важных момантах і інш.

Важным элементам мастацкага тэксту з'яўляецца эпіграф з верша Р. Барадуліна. У пераважнай большасці аўтары водгукаў правільна суаднеслі яго з асноўнай тэмай, паказалі, што эпіграф працуе на падрыхтоўку чытача да ўспрыняцця і асэнсавання зместу твора.

Аўтары прадэманстравалі добрыя творчыя здольнасці і арыгінальныя падыходы. Калі ў якасці формы водгуку быў абраны ўспамін, ліст, аналітычны тэкст, то гэтая форма практычна заўсёды вытрымлівалася да канца, фінал твора змяшчаў адсылку да яго пачатку, ствараючы эфект цэласнасці, закончанага лагічнага разважання. Таксама трэба адзначыць, што ў сёлетніх работах было адносна мала арфаграфічных і пунктуацыйных памылак. У асноўным памылкі былі маўленчыя, больш за ўсё звязаныя з ужываннем русізмаў.

## Комплексная работа

**Заданне 1** комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры было самым складаным у яе лінгвістычнай частцы. Словаўтваральная структура слова з'яўляецца далёка не відавочнай рэальнасцю, да таго ж яе прадстаўленне звязана з немалой колькасцю ўмоўнасцей, якія склаліся для даследчыкаў словаўтварэння ў няпростую сістэму. А гэтым разам удзельнікам алімпіяды давялося таксама аналізаваць складаныя словы, якія маюць сваю спецыфіку і часта, у параўнанні з простымі словамі, — дадатковыя элементы ў сваёй словаўтваральнай структуры. У прыватнасці, злучальны галосны, пра які немалая частка вучняў папросту забылася, у выніку чаго большасць слоў у заданні аўтаматычна аказалася разабранай недакладна, што і абумовіла атрыманне невысокага бала за гэта заданне. Аднак былі і іншыя, больш праблемныя моманты. Напрыклад, трэба ведаць, што, згодна з тэорыяй словаўтварэння, не кожнае складанае слова лічыцца ўтвораным шляхам складання — для яго ўтварэння можа быць дастаткова адной суфіксацыі, бо як словаўтваральная база для яго можа быць выкарыстана іншае складанае слова. У такіх суадносінах знаходзіцца, у прыватнасці, прыслоўе *сухавейна* з прыметнікам *сухавейны*. Для ўстанаўлення гэтых суадносін вучням неабходна помніць як аксіёму, што якасныя прыслоўі ўтвараюцца ад адпаведных ім прыметнікаў.

Больш складаным з'яўляецца размежаванне выпадкаў асноваскладання (яно заўсёды суправаджаецца суфіксацыяй, хаця б нулявой) і тых, калі аснова аднаго слова спалучаецца з цэлым словам. Прыклад апошняга ў заданні — слова *сухалес*. Розніца паміж выпадкамі тонкая, але прынцыповая. Калі ўзяць, напрыклад, слова *легкакрылы*, то ўбачым, што ўсе канчаткі, з якімі яно ўжываецца, як сістэма поўнасцю адрозніваюцца ад канчаткаў слова *крыло*, у тым ліку сваёй колькасцю, бо *легкакрылы* — прыметнік і мае яшчэ родавыя формы, а *крыло* — назоўнік і мае пастаяннае значэнне ніякага роду. Таму відавочна, што пры ўтварэнні складанага слова *легкакрылы* задзейнічана толькі аснова слова *крыло*. А вось каб атрымаць слова *сухалес*, прычым самым рацыянальным спосабам, з асновай прыметніка *сухі* трэба спалучыць (з дапамогай злучальнага галоснага, вядома) слова *лес* разам з усімі яго канчаткамі, бо нерацыянальна адкідаць, а потым далучаць тыя самыя канчаткі. А гэта азначае, што ў словаўтварэнні тут бярэ ўдзел цэлае слова, а не яго аснова. Натуральна, што ў гэтым выпадку няма месца ні для якага нулявога суфікса — у адрозненне ад прыметніка *легкакрылы*, у якім адсутнасць матэрыяльна выражанага суфікса функцыянальна раўназначная магчымаму канкрэтнаму суфіксу (параўнаем *легк-а-крыл-Ø-ы* і *лёгк-а-матор-н-ы*).

Яшчэ больш складанай задачай было вызначэнне часцінамоўнай прыналежнасці першай асновы ў слове *яснагляд*. Прынята лічыць, што ў падобных выпадках бярэцца аснова прыметніка. Але паколькі гэта слова можна суаднесці са словазлучэннем *глядзець* (як?) *ясна*, журы залічвала ўякасці правільных адказы, у якіх першым кампанентам называлася цэлае слова (прыслоўе) *ясна*. Дарэчы, трэба прызнаць, што фарміраванне навыку вывядзення складаных слоў з адпаведных ім словазлучэнняў спрыяе развіццю разумення ўнутранай логікі мовы, яе тонкага адчування. Таму аналіз словаўтваральнай структуры складаных слоў мае не толькі тэарэтычнае значэнне.

Безумоўна, разлічваць на тое, што большасць удзельнікаў алімпіяды (у спаборніцтве браў удзел 41 навучэнец) больш ці менш паспяхова справіцца з такім складаным заданнем, не даводзілася. Але журы можа з прыемнасцю адзначыць, што прапанаванае заданне сябе апраўдала, паколькі дазволіла вылучыцца ў лепшы бок шэрагу найлепш падрыхтаваных навучэнцаў, прычым адзін з іх здолеў атрымаць максімальную адзнаку. Былі таксама і балы, блізкія да максімальнага.

**Заданне 2** было разлічана на выяўленне арфаэпічных кампетэнцый школьнікаў. І калі, напрыклад, знаходжанне заўсёды мяккага гука [j] у такіх словаформах, як *засядае, сваёй, льецца, яснаглядам*, залежала ў большай ступені ад уважлівасці ўдзельнікаў конкурсу (трэба было не забыцца, што згаданы гук прысутнічае ў складах з ётаванымі літарамі, якія знаходзяцца ў пачатку слова, пасля галосных або мяккага знака, і заўважыць адпаведныя сітуацыі), то выяўленне выпадкаў асіміляцыйнай мяккасці патрабавала ўжо пэўнай падрыхтаванасці. Асабліва мэтанакіраваная падрыхтоўка патрэбная была для выяўлення мяккіх зычных у нетыповых спалучэннях ([ц'] у словаформе *пустацветы* і [н'] — у *асвянці*). Тым прыемней канстатаваць, што найбольш частым балам быў максімальны — яго атрымалі 16 удзельнікаў; 15 чалавек выканалі заданне, дапусціўшы па адной недакладнасці, пяцёра — па дзве (і атрымалі па 5 балаў роўна). Як бачым, колькасць тых, хто дапусціў больш за дзве памылкі, зусім нязначная.

**Заданне 3** паказала, што ў назвах адносін роднасці і сваяцтва вучні разбіраюцца амаль бездакорна, за выключэннем двух выпадкаў, калі алімпіяднікі вызначылі *свякроў* як ‘маці мужа ў адносінах да жончыных ці маці жонкі ў адносінах да мужавых бацькоў’.

Дапушчаныя пры выкананні **задання 4** некарэктнасці і неабгрунтаваныя сцверджанні былі даволі разнастайнымі, таму цяжка назваць сярод іх тыповыя. З гэтай прычыны прааналізуем толькі адно з іх, дзе мы ўбачылі пэўны дыдактычны рэзон. Так, некаторыя ўдзельнікі алімпіяднага конкурсу фармальна падышлі да сказа *Мноства абаронцаў на сценах і простых гараджан загінулі* і замест таго, каб падкарэктаваць у ім форму множнага ліку выказніка, сканцэнтраваліся на акалічнасці *на сценах*, якая стаіць паміж аднароднымі дзейнікамі, ад чаго нібы «губляецца сэнс». Аднак калі ацаніць рэальную карціну, апісаную ў сказе, то стане зразумелым, што на сценах маглі гінуць толькі абаронцы горада, а не ўсе гараджане. А каб апраўданая адпаведным зместам не зусім звычайная паслядоўнасць слоў у адным з фрагментаў сказа — *абаронцаў на сценах* — не ствarала першаснага (і для кагосьці — вырашальнага) уражання пра сябе як пра нібы памылковую, навучэнцы мусілі мець больш разгорнутыя веды пра магчымыя ў беларускай мове мадэлі словазлучэнняў.

Аналізуючы вынікі выканання **задання 5**, адзначым, што некаторыя вучні пры ўтварэнні разнастайных формаў дзеясловаў адрываюцца ад іх трывальнага значэння. У выніку яны выкарыстоўваюць не ўласную форму зыходнага дзеяслова, а нейкую блізкую, якая больш напрошваецца, таму што, верагодна, яна больш простая, больш ужывальная або перш за ўсё прыходзіць на памяць паводле нейкай выпадковай асацыяцыі. Як прыклад з бланкаў адказаў можна прывесці наступныя пары дзеясловаў з несапраўднай унутрыпарадыгмавай суадноснасцю: *застацца — застаючыся*; *дапамаглі — дапамагаць*; *выгнаць — выганяеце*; *дапамагчы — дапамагаеце*; *дапамагчы — дапамагаючы*. Апошні прыклад да таго ж парадаксальны таму, што ў бланку, дзе зафіксавана апошняя пара, для 2-й асобы мн. ліку запісана правільная форма — *дапаможаце*, а ад іншых дзеясловаў закончанага трывання ўтвораны таксама правільныя формы дзеепрыслоўяў — *застаўшыся* і *выгнаўшы*. Але, відаць, ёсць такія дзеяслоўныя формы (а напэўна, нават цэлыя марфаналагічныя мадэлі), якія для маладых людзей школьнага ўзросту аб'ектыўна выклікаюць цяжкасці, не ўяўляючыся рэальнымі. Пра гэта можа сведчыць няўдалая спроба ўтварэння дзеепрыслоўя ад дзеяслова *дапамагчы* з яшчэ аднаго бланка адказаў, дзе зафіксавана форма гібрыднага характару — *дапаможучы* (паказальна, што і ў гэтым бланку

іншыя дзеепрыслоўныя формы, *застаўшыся* і *выгнаўшы*, таксама ўтвораны правільна). З гэтага можна зрабіць выснову, што пры вывучэнні ў школе марфалогіі дзеяслова адной з важных задач настаўніка-філолага з'яўляецца высвятленне пэўнай колькасці падобных праблемных мадэляў утварэння дзеяслоўных формаў. Вельмі важна як мага больш акцэнтавана даводзіць да вучняў, што калі існуе пэўная трывальная пара дзеясловаў, то кожны кампанент гэтай пары з'яўляецца зусім самастойным, незалежным ад другога. І гэтая самастойнасць выяўляецца ў тым, што дзеяслоў закончанага трывання мае выключна сваю поўную сістэму граматычных формаў, а дзеяслоў незакончанага трывання — сваю, і гэтыя дзве сістэмы формаў абсалютна неперасякальныя паміж сабой.

**Заданне 6** для ўдзельнікаў алімпіяды выйшла ў цэлым няцяжкім. Таму аж шаснаццаць з іх былі ўзнагароджаны «шасцёркамі», яшчэ дзевяць чалавек атрымалі па пяць балаў, а трынаццаць — па чатыры. Адносна праблемнымі ў заданні выявіліся толькі дзве пазіцыі (№ 2 і № 4), прычым адпаведныя правільныя сцвярджэнні былі ацэнены як няправільныя ў аднолькавай колькасці адказаў — дванаццаці. Чаму больш за чвэрць канкурсантаў адмовіла словаспалучэнню *з невялікай адлегласці* ў статусе акалічнасці месца? Мяркуем, гэта звязана з тым, што прыметнік *невялікай* быў вызначаны як самастойнае азначэнне ў сказе. Але такое вызначэнне не можа быць прынята, паколькі без прыметніка акалічнасць губляе ўсялякі сэнс (а то і, калі засяродзіцца на вылучаным са сказа спалучэнні *з адлегласці*, змяняе яго на супрацьлеглы, што робіць суседства з прыметнікам *невялікай* унутрана супярэчлівым). Такім чынам, настаўнікам пры разборы па членах сказа варта як найчасцей звяртаць увагу вучняў на неабходнасць уліку сэнсавай самадастатковасці слоў або іх спалучэнняў як членаў сказа.

У **заданні 7**, як і ў чацвёртым, былі дапушчаны досыць разнастайныя памылкі, таму рабіць абагульняльны аналіз яго выканання не мае сэнсу. Адзначым толькі, што аднаму з удзельнікаў удалося атрымаць максімальны бал, яшчэ двaім — блізкія да максімуму 5,75 бала, а 5,5 бала атрымалі аж пяцёра. З улікам таго, што за кожную лексічную або граматычную памылку алімпіяднікі гублялі па паўбала, можна прызнаць, што ў цэлым дзесяцікласнікі паказалі: яны ўпэўнена валодаюць беларускай мовай у плане асноўных навыкаў.

**З заданнем 8** цалкам справіліся 24 удзельнікі; 14 удзельнікаў не справіліся з апошняй схемай, прапанаваўшы замест тэрміна «эпілог» такія варыянты адказу, як «канцоўка», «заканчэнне дзеяння», «канец дзеяння» і пад. Яны непрымальныя з той прычыны, што фактычна адпавядаюць апошняму з адзначаных ва ўмове сюжэтна-кампазіцыйных элементаў твора — развязцы, таму што яна, з'яўляючыся заключным этапам у развіцці дзеяння (канфлікту, сюжэта), і ёсць заканчэнне дзеяння, пасля яе дзеянне ўжо не развіваецца. Некаторыя з канкурсантаў прапанавалі адказ «пуант», але ў літаратуразнаўстве гэты тэрмін ужываецца ў значэнні 'заключная дасціпная фраза (частка фразы) якога-небудзь жарту ці загадкі'. Гэта не суадносілася з умовай задання, таму такі адказ таксама не лічыўся правільным.

Нязначная колькасць памылак была звязана з няправільным вызначэннем тыпу рыфмоўкі (4 удзельнікі назвалі яе паслядоўнай замест сумежнай / парнай). Нагадаем, што рыфмоўка — спосаб спалучэння клаўзул і паводле спосабу рыфменнай сувязі ў чатырохрадкоўі яна можа быць сумежнай (аабб), перакрыжаванай (абаб), апаяснай, або кальцавой (абба). Такога ж спосабу рыфмоўкі, як «паслядоўная», не існуе. Сярод адзінкавых — памылкі ў вызначэнні літаратурных стыляў (адказ «рэалізм» замест патрэбнага «рамантызм») і сярэдніх эпічных формаў (адказ «паэма» замест патрэбнага «аповесць» у адным шэрагу з «апавяданнем» і «раманам»).

**Заданне 9.** Нягледзячы на тое, што алімпіяда праходзіла ў юбілейны для Янкі Купалы і Якуба Коласа год, поўнасцю справіліся з заданнем, прысвечаным жыццю і творчасці нашых песняроў, толькі 5 удзельнікаў конкурсу. Яшчэ 10 дапусцілі 1-2 памылкі. Ад 3 да 5 памылак зрабілі 19 удзельнікаў. Найгоршае веданне фактаў біяграфіі і творчасці юбіляраў паказалі 7 чалавек, дапусціўшы ад 6 да 10 памылак у 12 магчымых правільных варыянтах адказу.

Такім чынам, больш за 50 % правільных адказаў пазначылі 34 канкурсанты. Не змаглі прадэманстраваць належнае веданне фактаў жыцця і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа 7 вучняў, пазначыўшы 50 % (3 чалавекі) і менш (4 чалавекі) правільных адказаў.

Аналіз адказаў паказвае, што падзеі жыцця і творчасці Янкі Купалы навучэнцы ў цэлым ведалі лепш, чым факты з жыцця і творчасці Якуба Коласа (прыкладна ў суадносінах 61 % на 39 %). Акрамя таго, удзельнікі алімпіяды лепш арыентаваліся ў падзеях з жыцця і творчасці класікаў і горш — у датах, да якіх гэтыя падзеі адносяцца. Так, найчасцей

правільна вызначаліся дата нараджэння Янкі Купалы (89 %); факт і дата ўдзелу Якуба Коласа ў нелегальным настаўніцкім з'ездзе (87 %); аўтарства зборнікаў «Жалейка», «Гусляр» (Янка Купала; 76 %) і «Песні жальбы» (Якуб Колас; 68 %) і не заўсёды правільна — даты выдання гэтых зборнікаў. Назіралася блытаніна і ў вызначэнні аўтарства некаторых іншых прапанаваных у заданні твораў. Так, не ўсе згадалі, што аўтарам «Першага чытання для дзетак беларусаў» з'яўляецца Цётка (хаця пры гэтым правільна адзначалі дату выхаду кнігі — 1906 г.), пераблытаўшы, верагодна, з «Другім чытаннем для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа. Гэтаксама асобныя ўдзельнікі прыпісвалі Янку Купалу ці Якубу Коласу аўтарства апавядання «Музыка» (М. Багдановіч, 1909 г.) і зборніка імпрэсій «Абразкі» (Змітрок Бядуля, 1913 г.).

Няўважлівасцю прачытання ўмовы задання можна патлумачыць і факт аднясення да ліку правільных адказаў падзеі 8 — «Беспадстаўна абвінавачаны ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і арыштаваны». Па-першае, умова задання грунтавалася на тым, што кожнай падзеі адпавядала дата, калі гэта падзея адбылася. Напрыклад, па гэтай самай прычыне падзея 9 «Атрыманне звання народнага паэта БССР» з *пазначаным* у радку 1926 г. лічылася правільным адказам толькі ў дачыненні да фактаў жыцця Якуба Коласа, а не Янкі Купалы, які атрымаў гэта званне ў 1925 г. Па-другое, у пачатку 1920-х гг. Янка Купала неаднаразова падазраваўся ў нядобранадзейнасці і нацыяналістычных поглядах (што нераўназначнае контррэвалюцыйнай дзейнасці); у 1921 г. у яго канфіскавалі рукапісы, а сам ён трапіў пад *хатні* арышт, які нераўназначны знаходжанню ва ўстанове для арыштантаў органаў пакарання. Дарэчы, даты «1921 г.», калі Купала знаходзіўся пад хатнім арыштам, у радку дат не было. Некаторыя ўдзельнікі пазначалі 1930 г., але з гэтай датай звязаны арышт Паўліны Мядзёлкі, першага кахання Купалы, у сувязі з абвінавачаннем у антысавецкай дзейнасці і шматразовыя выклікі самога Янкі Купалы на допыты ў АДПУ (НКУС), што ўрэшце прывяло яго да спробы самагубства. Да фактаў, звязаных з жыццём Якуба Коласа, гэта падзея таксама не мае дачынення.

З улікам выкладзеных вышэй акалічнасцей «падзея 8» не лічылася правільным адказам.

За **заданне 10** можна было атрымаць максімум 6 балаў — па два за кожную з трох частак. У частцы А трэба было даць тлумачэнне, чаму прапанаваная назва «"Радзіма мая дарагая...": беларускія грамадзянскія творы» не адпавядае зместу зборніка. У частцы Б неабходна было прапанаваць дзве новыя назвы зборніка, выходзячы з розных прынцыпаў яго ўкладання. Пры гэтым трэба было ўлічваць, што тэматычны прынцып быў ужо выкарыстаны, таму арыентавацца неабходна на іншы (напрыклад, родава-жанравы, храналагічны, гендарны). У частцы В патрабавалася дапоўніць змест кожнага новага зборніка двума іншымі творамі, якія б адпавядалі прапанаваным новым прынцыпам укладання.

Бездакорна справіліся з гэтым заданнем 14 чалавек. Але неабходна адзначыць, што зусім нізкіх балаў не было. У частцы А практычна ўсе адзначылі, што вершы «Бывай...» А. Куляшова і «Шчасце» Максіма Танка не належаць да грамадзянскіх.

У частцы Б асноўная памылка была ў тым, што новыя зборнікі прапаноўвалася ствараць па ўжо выкарыстаным тэматычным прынцыпе. Напрыклад, у зборніку пад назвай «Спадчына» канкурсанты прапаноўвалі змясціць вершы пра Беларусь, у зборніку «Скарбонка маёй спадчыны» — вершы пра беларусаў і Беларусь. Разам з тым былі цікавыя адказы, у якіх прапаноўваўся адрозны прынцып укладання зборнікаў, давалася арыгінальнае лагічнае тлумачэнне падбору твораў. У зборніку «Сыны беларускай зямлі» было прапанавана змясціць творы аўтараў-мужчын, зборнік «Паэзія роднага краю. Выбраныя творы» аб'яднаў творы розных відаў лірыкі, а зборнік «Бурштынавы куфар» — вершы, што ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры.

Сустракаліся традыцыйныя назвы кніг, напрыклад «Паэзія XIX—XX стст.», дзе аб'яднанне грунтавалася на храналагічным прынцыпе, а былі арыгінальныя — у прыватнасці «Выдатныя ЗК2МЗА». У апошнім выпадку тлумачэнне падбору тэкстаў было наступнае: у трох аўтараў прозвішча пачынаецца з літары К, у двух імя пачынаецца з літары М, у трох імя пачынаецца з літары А, і ўсе аўтары з'яўляюцца выбітнымі паэтамі.

У частцы В навучэнцы паказалі добрае веданне айчыннай літаратуры і дапоўнілі свае гіпатэтычныя зборнікі тэкстамі. Падбор вершаў адпавядаў канцэпцыі прыдуманых зборнікаў і ўключаў шмат твораў, якія не ўваходзяць у вучэбную праграму.